УДК 329.14:94(476) “1903/1917”

**Алена ТОГУЛЕВА**

*Дэкан факультэта перападрыхтоўкі кадраў, дацэнт кафедры гісторыі і культурнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускай дзяржаўнасці, гісторыя Беларускай сацыялістычнай грамады і беларускага нацыянальнага руху.*
*Аўтар больш за 50 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў.*



# ДЗЕЙНАСЦЬ БСГ
## *па вырашэнні аграрнага пытання на Беларусі*

**Аграрнае пытанне для Беларусі, дзе асноўная маса насельніцтва да сярэдзіны XX ст. займалася сельскагаспадарчай працай, з’яўлялася адным з самых галоўных. У пачатку XX ст. назіралася абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў у вёсцы. Гэта тлумачылася тым, што аграрная рэформа 1861 г., якая адмяніла прыгоннае права і павінна была стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы, была праведзена ў інтарэсах буйных землеўладальнікаў і не ліквідавала цалкам феадальныя перажыткі, якія стрымлівалі развіццё вытворчых сіл у вёсцы. У пачатку XX ст. на беларускіх землях панавалі сялянскае малазямелле, цераспалосіца, сервітуты, на ўсходзе — абшчыннае землекарыстанне, адпрацоўкі і іншыя рэшткі феадальных адносін, што даводзілі беларускага селяніна да гаротнага становішча. Першая беларуская нацыянальная партыя — Беларуская рэвалюцыйная грамада (пазней — Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ)) пачынаючы з часу свайго стварэння актыўна займалася аграрным пытаннем.**

**Ключавыя словы:** *палітычная партыя, Беларуская сацыялістычная грамада, аграрнае пытанне, рэвалюцыя, нацыянальнае адраджэнне, партыйная праграма*

У снежні 1903 г. у Вільні адбыўся першы з’езд партыі, на якім была прынята яе праграма. Тым не менш яе нельга лічыць у поўным сэнсе праграмай, хутчэй гэта быў эскіз, які аб’ядноўваў у сабе многія тэарэтычныя палажэнні ППС, Бунда, эсэраў. У ім БСГ характарызавала сябе як сацыяльна-палітычная арганізацыя беларускага працоўнага народа. Сваёй канчатковай мэтай яна абвясціла знішчэнне капіталістычнага ладу і пераход у грамадскую ўласнасць зямлі, сродкаў вытворчасці і камунікацый. Бліжэйшай задачай было звяржэнне самадзяржаўя ў Расіі ва ўзаемадзеянні “*з пралетарыятам усіх народаў Расійскай дзяржавы*” [1, с. 356].

Па аграрным пытанні патрабавалася скасаванне прыватнай уласнасці на зямлю, абвяшчала права кожнага чалавека на апрацоўку зямлі “*сваімі рукамі без карыстання з чужой працы*” і заяўляла аб неабходнасці адначасовай прапагандны “*ідэі ўсестаронняга сябравання і таварыстваў*” з мэтай пераходу да сацыялістычнай гаспадаркі [1, с. 356]. У гэтым праграмным эскізе былі вызначаны агульныя прынцыпы вырашэння аграрнага пытання на аснове сацыялізацыі зямлі, якія не ўлічвалі спецыфіку землеўладання на Беларусі, а распрацоўка больш акрэсленай аграрнай праграмы была яшчэ наперадзе.

Абвастрэнне сацыяльна-эканамічных супярэчнасцяў у Расіі і наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі актывізавала дзейнасць першай беларускай нацыянальнай партыі. Першая расійская рэвалюцыя пачалася 9 студзеня 1905 г., калі загадзя падрыхтаваныя войскі па загадзе цара ў розных месцах Пецярбурга расстралялі масавыя шэсці рабочых, якія накіроўваліся да Зімняга палаца з просьбай палепшыць становішча працоўнага народа. Гэтай акцыяй царскі ўрад спадзяваўся прадухіліць рэвалюцыю. Аднак атрымалася непрадбачанае: залпамі на Дварцовай плошчы і ў іншых месцах сталіцы была расстраляна не рэвалюцыя, а вера народа ў цара. Абудзілася каласальная рэвалюцыйная энергія. Магутныя, непрадбачаныя раней хвалі пратэсту — стачак, вулічных дэманстрацый і маніфестацый рабочых — пракаціліся па ўсёй краіне, у тым ліку і па Беларусі.

У выніку апісаных рэвалюцыйных падзей БСГ пашырыла сваю дзейнасць. Як і раней, Грамада мела на мэце працаваць з беларускім сялянствам, якое паўстала супраць зямельнага капіталу, але разам з тым яна пачынала працаваць і сярод рабочых-беларусаў Мінска, Вільні і Нова-Вілейкі.

У сакавіку 1905 г. Грамада разам з партыяй эсэраў склікае ў Мінску першы сялянскі з'езд, пасля якога была выдадзена пракламацыя "Першы мужыцкі з'езд". У гэтай пракламацыі БСГ закладае агульныя рысы сваёй будучай аграрнай праграмы: *"Усякі ведае, што мужыку цяжка жыць на свеце. З мужыкоў цар дзярэ падаткаў больш як за ўсіх: паны плацяць 236 млн рублёў у год, а мужыкі 700 млн, значыць у тры разы больш, а зямлі ў цара і паноў у два разы болей, як у мужыкоў, і цар, і паны, і чыноўнікі — усе жывуць з цяжкай мужыцкай працы..."* [2, арк. 4—5].

Далей гаворыцца аб тым, што з вышэйапісанай прычыны ў Мінск з'ехаліся прадстаўнікі ад сялян, каб вырашыць, што ім рабіць. Яны надумаліся, *"каб кожны, хто хоча на зямлі працаваць, мог дастаць столькі зямлі, колькі яму трэба, каб з яе сваёй працай пражыць; трэба значыць, каб уся зямля належала да тых, хто на ёй працуе. Дзеля гэтага трэба ўсю зямлю адабраць ад цара, казны ды паноў..."* [2, арк. 4—5].

БСГ разумела, што добраахвотна зямлю ніхто не саступіць і без грамадзянскай вайны не абысціся. Таму неабходна запасацца зброяй, каб абараняцца і заваяваць новы парадак карыстання зямлёй: "...*Але павінны мы ведаць,* — гаварылася ў пракламацыі, — *што цар пашле на нас паліцыю, жандараў, казакаў ды салдат, каб бараніць сваю і панскую зямлю ды біць і страляць нас. Тады выйдзе вялікая сварка, выйдзе вайна, і трэба нам да гэтага прыгатавацца. Трэба дастаць стрэльбы, рэвальверы і вінтоўкі, каб было чым абараніцца і заваяваць новы парадак карыстання зямлёй кожнаму, хто на ёй сам працуе"* [2, арк. 6]. Такія рэвалюцыйныя лозунгі былі характэрны для БСГ у пачатковы перыяд рэвалюцыі.

Разгледзім на прыкладзе двух праектаў, які парадак землекарыстання ў сакавіку 1905 г. Грамада прапаноўвала ўстанавіць, калі зямля будзе заваявана сялянамі.

У першым праекце прапаноўвалася калектыўнае карыстанне зямлёй: *"Добра было б, каб уся вёска, ці часць яе, калі яна надта вялікая, не дзяліла зямлі, але каб вяла гаспадарку гуртам. Выбрала б яна сабе чалавек пяць такіх, што ўмеюць чытаць ды пісаць і шчоты ўмеюць весці, і тыя выбраныя каб запісвалі, колькі дзён кожны мужык на зямлі працаваў. Восенню кожны возьме сабе столькі хлеба, каб пракарміцца, а рэшту прададуць гуртам і дадуць кожнаму столькі грошай, колькі яму на рабоце выходзіць"* [2, арк. 4].

БСГ, улічваючы настрой сялянства як дробнаўласніцкі, відаць, баялася свой праект дэталізаваць, каб не адхіліць сялян ад рэвалюцыйнай барацьбы за зямлю. Яна лічыла іх нясталымі, таму прапанавала другі праект, па якім *"кожная сям'я дастае столькі зямлі, колькі на яе выпадае. На гэтай зямлі працуюць 12 год ці меней, а потым выбарныя з усёй вёскі глядзяць, калі ў яго дзяцей прыбыло, то яму зямлі прыбаўляюць, калі дзяцей паменшыла — аднімаюць. Пры гэтым спосабе кожны вядзе гаспадарку асобна"* [2, арк. 4].

Тым часам рэвалюцыйныя падзеі ў краіне набіралі моц. Трэба было выкарыстаць усе магчымыя сродкі барацьбы за зямлю. Летам 1905 г. БСГ рыхтуе забастоўку парабкаў і беднага сялянства Беларусі, у выніку якой яны атрымаюць большы заробак, а сяляне — значныя палёгкі, залежныя ад двара. З мэтай арганізацыі забастоўкі Грамада ў чэрвені выдае колькасцю 10 000 асобнікаў пракламацыю "*Да ўсіх работнікаў і работніц дваровых, да ўсіх дзеравенскіх людзей на туташняй зямлі Беларускай*", у якой раіць сялянам. як абараняць свае правы [3, с. 157].

Звычайна ў агітацыйнай літаратуры 1905 г. гаворыцца аб сялянстве як аб адным цэлым, яно рэдка падзялялася на батракоў, вясковае сялянства і кулакоў. БСГ падзяляе сялянства на некалькі груп, якія маюць свае ўласныя эканамічныя патрэбы — гадавых дворных парабкаў, падзённых работнікаў, дворную чэлядзь і наогул сялянства — гэта "*ўсе дзеравенскія людзі*". Даводзіцца, што мужыкі абліваюць зямлю сваім потам і што з іх крывавай працы жывуць паны, чыноўнікі і іншыя дармаеды. Зямля — нічыя, і ёй павінны карыстацца тыя, хто на ёй працуе.

Каб адабраць ад паноў і казны зямлю, трэба арганізавацца ў адну грамаду. Пакуль такой грамады няма, адабраць зямлю немагчыма, дзеля гэтага трэба дабівацца большай карысці ад сваёй працы. Таму працоўнай вясковай беднаце, як гэта робяць работнікі на фабрыках і заводах, трэба забастоўкай дабівацца ад паноў большай платы за сваю працу. Дзеля гэтага трэба згаварыцца і разам не пайсці на панскую працу. пакуль пан не задаволіць выстаўленых патрабаванняў. Падзённым работнікам і работніцам раілася: "*Сёлета ад Пятра і Паўла згаварыцеся і ня ідзіце на работу, калі памешчыкі ня будуць плаціць за работу на палавіну болей, як цяпер, а дзе зусім мала плацяць — у два разы болей. Калі дастанеце гэты лісток пасля Пятра і Паўла, то пачніце зараз забастоўку*" [3, с. 157]. Далей ішлі патрабаванні людскага абыходжання: 4 гадзіны на адпачынак, 1 гадзіна на снеданне, 3 гадзіны на палудзень і прыбаўка платы за працу пасля заходу сонца.

Гадавым работнікам і работніцам і ўсёй дваровай чэлядзі раілася гэтаксама запатрабаваць напалову павысіць плату, а малую ў два разы; асобных хат для сямейных сялян; дастаткова ардынарыі і ежы: разы 2—3 на тыдзень мяса і ад вясны да восені "*на падвячорак, хоць па квартцы несабіранага салодкага малака кожны дзень*".

Усім "дзеравенскім людзям" прапаноўвалася напалову паменшыць арэнду, не плаціць пану за пусткі, якія знаходзіліся ў вёсцы, дазволіць збіраць у лесе грыбы, ягады, мох, хворост, "нікога не пытаючыся", разбураць у панскіх млынах застаўкі, калі яны затапляюць вясковыя сенажаці і не дазваляць адбудоўваць іх

нанава і інш. *"Цвёрда трымайцеся, — гаворыцца ў канцы пракламацыі, — згаварыцеся разам усе і не ўступайце, не ідзіце на работу, пакуль усяго гэтага, што вы патрабуеце, вам ня зробяць. Калі ёсць у вас яшчэ якія патрэбы, апрача гэткіх, то і аб іх заявіце памешчыкам..."* [3, с. 158].

Згодна з гэтай пракламацыяй дзейнічалі парабкі фальварка Лошыца недалёка ад Мінска, якія ўчынілі забастоўку і прапанавалі памешчыку ўстанавіць 14-гадзінны працоўны дзень, змяніць аканома, павялічыць ардынарыю і інш. [4, с. 264].

Безумоўна, гэтыя патрабаванні мелі вельмі абмежаваны характар, але тым самым яны ўносілі элемент арганізацыі ў выступленні сельскагаспадарчых рабочых. Дзякуючы працы беларускіх рэвалюцыянераў сацыялістычныя ідэі вызвалення ад самадзяржаўя і эканамічнага ўціску ўпершыню трапілі ў глухія закуткі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў.

У студзені 1906 г. у Мінску быў скліканы II з'езд БСГ, на парадак дня якога былі пастаўлены наступныя пытанні: перагляд партыйнай праграмы, распрацоўка аграрнай праграмы і тактыкі партыі, арганізацыйныя пытанні і выбранне ЦК [5, с. 27].

Гарачая дыскусія на з'ездзе ўзнікла па трэцяй частцы праграмы па аграрным пытанні. Спрэчка ўсчалася паміж братамі Луцкевічамі — Антонам Іванавічам і Іванам Іванавічам, бо кожны з іх меў сваю пазіцыю па яго вырашэнні. Як указвае А.Луцкевіч [5, с. 24], яго брат лічыў неабходным даць сялянству як больш зразумелы яму лозунг *"Дзялі зямлю!"*, разлічаны на ўзмацненне рэвалюцыі. Ён глядзеў на яе развіццё больш аптымістычна, чым іншыя дэлегаты з'езда. А.Луцкевіч з А.Уласавым падрыхтавалі праект аграрнай праграмы, і таму ён, наадварот, схіляўся да погляду, што рэвалюцыйны выбух ужо заканчваецца і пачынаецца рэакцыя, супраць якой партыя бяссільна. Таму яго праект праграмы па зямельным пытанні прадугледжваў паступовы рух да яе ажыццяўлення.

Праграмай прадугледжвалася абагульненне ўсіх памешчыцкіх, царкоўных, казённых і ўдзельных зямель, каб з іх утварыліся рацыянальна арганізаваныя хутары, якія б былі здольныя пры дастатковай колькасці зямлі не толькі пракарміць сялянскую сям'ю, але і пастаўляць хлеб і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты на рынак у горад. Пры дапамозе краёвай улады такія хутары маглі б арганізоўваць вытворчыя прадпрыемствы ў форме кааперацыі для перапрацоўкі сыравіны на месцы тымі сялянамі, якім не хапіла б хутароў. Такім чынам, у вёсцы замест буйной і сярэдняй зямельнай буржуазіі — па нацыянальнасці польскай і рускай — стварыўся б новы клас дробных вытворцаў-хутаран, па нацыянальнасці беларускі. Як зазначаў А.Луцкевіч, *"я лічыў, што хутаране-кулакі стануць на чале нараджаючагася беларускага народа і што, дзякуючы матэрыяльнаму забеспячэнню, з гэтага асяроддзя будзе вырастаць беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, атрымліваючы адукацыю ў сярэдніх і вышэйшых школах. Такім чынам, мой праект зямельнай праграмы, вырашаючы зямельную праблему толькі ў адносінах да той часткі сялян, якой дастануцца добраўпарадкаваныя хутары, пакідаў незадаволенай астатнюю масу сялянства, пераводзячы яе ў становішча зямельнага пралетарыяту"* [6, с. 131].

На II партыйным з'ездзе аграрная праграма Антона Луцкевіча была падтрымана і прынята як праграма БСГ. Яна складалася з наступных пунктаў:

1) утварэнне абласных зямельных фондаў з касцельных, царкоўных, удзельных, кабінецкіх, манастырскіх і прыватнаўласніцкіх зямель;



Антон Луцкевіч у часе вучобы ў Юр'еўскім універсітэце. 1910-я гг.



Іван Луцкевіч. Фота 1915 г.

2) малазямельным і беззямельным працуючым на зямлі неабходна раней за ўсіх адкрыць доступ да зямлі для пажыццёвага карыстання; перавага на карыстанне ўчасткамі грамадскай зямлі, якую пакінуў земляроб па прычыне непрацаздольнасці, смерці і г. д.,

аддаецца яго бліжэйшым супрацоўнікам. Доступ да зямлі па магчымасці павінен быць забяспечаны матэрыяльнай падтрымкай тых, хто адчувае патрэбу ў ёй для завядзення гаспадаркі;

3) зямельная рэнта павінна быць уласнасцю краю і перайсці ў карысць самапрацуючых абласных арганізацый;

4) абласныя дзяржаўныя арганізацыі вызначаюць форму і парадак канфіскацыі зямель;

5) дробныя самакіраваныя арганізацыі вызначаюць колькасць зямлі, неабходную для забяспячэння працоўных на зямлі.

*"БСГ патрабуе пераходу ў грамадскую ўласнасць лясоў, паш і вадзяной сілы"* [7, с. 161].

Такім чынам, у пачатковы перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. БСГ схілялася да рэвалюцыйнага вырашэння аграрнага пытання, нават добра разумела магчымасць грамадзянскай вайны за зямлю. Але па меры адступлення рэвалюцыі і абмеркавання праектаў вырашэння зямельнага пытання на Беларусі, на II з'ездзе БСГ была прынята аграрная праграма, якая арыентавалася не на рэвалюцыю, а на рэфармісцкі, па сутнасці ліберальны шлях развіцця. Гэты ж момант вызначыў і далейшую эвалюцыю грамадоўцаў да "нашаніўскага" перыяду, калі БСГ зрабіла вялікую эвалюцыю ўправа, паступова адмаўляючыся ад сваіх радыкальных і нават рэвалюцыйных заклікаў 1905 г.

Цэнтрам беларускага рэвалюцыйнага і культурнага руху ў канцы 1906 г.— 1907 г. стала Вільня. Сюды пераехалі браты Антон і Іван Луцкевічы, і менавіта тут разгарнулася выдавецкая дзейнасць БСГ. Вялікай колькасцю выходзілі беларускія лісткі і брашуры, зборнікі рэвалюцыйных апавяданняў і вершаў. У верасні 1906 г. у Вільні пачала выдавацца першая легальная беларуская газета "*Наша Доля*", прызначаная для "*вясковага і местачковага рабочага люду*". Газета з'яўлялася органам БСГ, выходзіла раз на тыдзень кірыліцай і лацініцай. "*Лічачы найбольшым нашым ворагам цямноту і бяспраўнае палажэнне мужыка,* — адзначалася ў перадавым артыкуле першага нумара, — *мы аб'яўляем вайну ўсім цёмным сілам, каторым дзеля сваёй карысці вялікая выгода была трымаць васьмімільённы народ беларускі ў нядолі і паневерцы, баламуціць і дурыць яго*" [8, с. 2].

Прадстаўнік правага ліберальнага крыла БСГ Ф.Умястоўскі, які ўваходзіў у склад рэдакцыі, у звароце да чытачоў пісаў: "*Дайце беларусу такую кніжку, каб ён зразумеў, што ў ёй напісана. Толькі кніжка, напісаная на мове бацькоў яго, патрапіць сноп свету закінуць у цяжкае жыццё беларуса, толькі яна пакажа яму дарогу да лепшае, яснейшае долі!*" [8, с. 1]. Кніга, асвета — крэда ўсіх буржуазных асветнікаў, якога трымалася і ліберальна-буржуазная частка Грамады. Сутнасць іх платформы — культурна-нацыянальнае адраджэнне.

Артыкул "*Што будзе*", у якім адлюстравана пазіцыя цэнтра БСГ, мае выразны антыўрадавы характар: "*Правіцельства... не дасць народу ні зямлі, ні праўдзівае свабоды... Асталося яму адно з двух — або так, як даўней, прападаць з голаду, або самому памысліць аб сваёй долі. І ён выступіў на бой за шчасце ўсёй працавітай беднаты... Цяпер бунтаўшчык — увесь стомільённы цёмны, галодны народ. Але штыкамі і кулакамі можна прыдушыць народ, можна з усяе Расіі зрабіць адну вялікую магілу, а не ўпраўляць жывымі людзьмі...*" [9, с. 2—3]. Артыкул завяршаецца высновай, што ўрад можна скінуць, калі ён не захоча выканаць патрабаванні народа.

Сацыяльна-палітычныя погляды беларускай паэткі А.Пашкевіч і левага крыла Грамады выказаны ў гэтым жа нумары ў адным з лепшых яе твораў апавяданні — "*Прысяга над крывавымі разорамі*". Яно паказала, што Цётка ў 1905—1906 гг. стаяла на рэвалюцыйным разуменні сутнасці падзей свайго часу, характару, задач і галоўных сіл рэвалюцыі. У адказ на голас народа: "*Вузка! Цесна! Мала!*" — "*Прысяга*" адказвае: "*Глядзіце! Во — прасторы! Во — нівы, лясы, палі! Усё гэта —*

Першая старонка газеты "Наша Ніва" за лістапад 1906 г


Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год 1. Вильня 24 листопада (Ноября) 7 грудня (декабря) 1906 г. № 3.

# Наша Нива

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМИ

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литэрами.

Ад Рэдакции.

НОЧКА.

Кольки дум ты мне нанесла,
Ночка цёмная мая;
Кольки слез в душу насеяла,
Кольки гора ґрынесла!
Цёмна ты, длинна, невесела,
Так як жыцце мужыка...
Тольки хмароў нанавесила
З них дожч льецца, як рэка.

Вот кабы скончалась ночанька,
Каб дасьць светленьки настаў;
И каб на то мая моченька,
Гэтуб цёмнасць разагнаў.
Доўга, доўга людзям прыдзецца
Шчасця на зямли шукаць;
Не одна к нам ночка вернецца
Новы думки навяваць...

З. К.

300457

Першая старонка газеты "Наша Доля" за 1 верасня 1906 г.


Цана асобнаго нумэру 5 кап.

Вильня, 1 сентября 1906 г.

№ 1.

# Наша Доля

першая белоруская газэта для вёсковаго и местоваго рабочаго народу.

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литерами.

Адрэс рэдакции и администрации: Вильня, Виленская вулица 32

АБЪЯУЛЕНИЯ прыймаюцця на наследний страницэ па 20 кап. за линейку пэтиту.

Рукаписы и карэспандэнции, прысыланыя у Рэдакцию, мусяць быць чытэльна написаны з фамилией и адрэсомъ таго, хто ее прысылае. Адрэсъ тольки для ведама Рэдакции.

*наша!"*. Галоўнымі героямі гэтага твора з'яўляюцца дворны парабак, салдат і пецярбургскі рабочы — родныя браты, што выйшлі з народа: *"Мы дамо! Мы — сіла, мы — права!"* [10, с. 3—4].

Першы нумар "Нашай Долі" выйшаў у свет дзвюхтысячным накладам (палова была выдадзена лацінскім шрыфтам) і разыходзіўся надзвычай хутка: амаль адразу было прададзена 5 тысяч асобнікаў. Як паведамляе беларускі гісторык М.Біч, за артыкул *"Што будзе"* і нататку *"Даход расейскага цара"* афіцыйны выдавец і рэдактар "Нашай Долі" І.Туркеркес быў абвінавачаны па 129-м, самым небяспечным артыкуле Крымінальнага ўлажэння, які пагражаў закрыццём газеты і турмой асобе, адказнай за яе выпуск. Але Віленская судовая палата не зацвердзіла распараджэнне адміністрацыі, адмовіла ў закрыцці газеты і адмяніла накладзены на першы нумар арышт [11, с. 35].

У другім і трэцім нумарах "Нашай Долі" быў змешчаны артыкул пад назвай *"Як мужыку палепшыць сваё жыццё?"*, у якім сялянам настойліва раілася выбраць для дасягнення мэты такі ж шлях, на які сталі рабочыя. У канцы артыкула выказваецца ўпэўненасць, што такі грамадскі лад, які лічыць непазбежным існаванне багачоў і жорстка эксплуатуемых імі беднякоў, не вечны, бо ён — стварэнне зусім не Бога, а рук чалавечых, і людзі самі знішчаць у ім усё благое: *"Зрабіць гэту перамену можа толькі ўвесь народ, уся вясковая і мястовая бедната, калі ўсе разам пойдуць па адной дарозе, дзеля чаго ўсе мужыцкія саюзы павінны злучацца праз свае камітэты з рабочымі саюзамі і партыямі ў горадзе"* [12, с. 2].

18 лістапада — 1 снежня 1906 г. пад рэдакцыяй Адама Гедвілы выйшлі два апошнія нумары "Нашай Долі". Яны былі канфіскаваныя. Сёмы нумар паліцыя знішчыла яшчэ ў наборы. М.Біч паведамляў: *"Рашэннем Віленскай судовай палаты ад ІІ студзеня 1907 г. выданне "Нашай Долі" было забаронена назаўсёды. Царызм па вартасці ацаніў ролю і значэнне першай легальнай беларускай газеты, прызнаўшы ў ёй ворага, які не жадае ісці на кампраміс з ім"* [11, с. 138].

З закрыццём "Нашай Долі" заканчваецца і перыяд рэвалюцыйнай дзейнасці БСГ, і наогул перыяд існавання яе як партыі. Хаця ў канцы 1906 г. — пачатку 1907 г. БСГ яшчэ выдала некалькі падпольных брашур і лістовак рэвалюцыйна-дэмакратычнага зместу: *"Чы будзе для ўсіх зямлі"*, *"Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць"* і *"Забастоўка"*, — гэта былі апошнія крокі яе рэвалюцыйнай дзейнасці. Мясцовыя арганізацыі левых партый у ходзе наступлення рэакцыі летам і восенню 1907 г. былі амаль паўсюдна разгромлены ці вельмі аслаблены. У гэты час, як зазначаў адзін з актыўных членаў БСГ А.Бурбіс, *"арышты і ссылкі руйнуюць беларускія рэвалюцыйныя арганізацыі..."* [13, с. 9].

У гэты ж час у Вільні пачала выходзіць другая легальная беларуская газета — *"Наша Ніва"*. Вакол яе групаваліся грамадоўцы буржуазна-ліберальнага напрамку, якія паставілі на мэце культурна-нацыянальнае адраджэнне.



*Алаіза Пашкевіч. Фота 1912 г.*

Першы нумар "Нашай Нівы" выйшаў у свет 10 (23) лістапада 1906 г. У ім рэдакцыя паведамляла: *"Не думайце, што мы хочам служыць толькі ці панам ці адным мужыкам. Не, ніколі не! Мы будзем служыць усяму беларускаму скрыўджанаму народу, пастараемся быць люстрам яго жыцця, каб ад нас, як ад люстра, свет падаў у цёмнасць... Ня будзем пісаць громка. Будзем спакойна, цвёрда кідаць усім праўду ў вочы... нехай халодны розум моцна трымае ў сваіх руках гарачае сэрца..."* [14, с. 1]. "Наша Ніва" на доўгі час робіцца адзіным цэнтрам беларускага нацыянальнага жыцця, выказніцай патрэб і інтарэсаў працоўных мас, павадыром беларускай інтэлігенцыі, якая адраджалася.

"Наша Ніва" адыграла значную ролю ў развіцці беларускай літаратуры, менавіта ў ёй убачылі свет творы Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Ц.Гартнага, З.Бядулі, А.Гаруна і інш. Газета мела больш за тры тысячы карэспандэнтаў. Згодна з заявай рэдакцыі, за першыя тры гады існавання "Наша Ніва" змясціла 960 дописаў з 489 вёсак, надрукавала 2146 вершаў 61 паэта, апублікавала 91 апавяданне 36 аўтараў [15, с. 17].

"Наша Ніва" дзейнічала амаль 10 гадоў. З.Жылуновіч у артыкуле *"Два бакі беларускага руху"* адзначаў, што *"...беларуская газета "Наша Ніва" пад выглядам культурнай газеты з'яўлялася самай радыкальнай газетай ня толькі ў Беларусі, а і ва ўсёй Расіі, нялічачы сацыялістычных газет, ужо ў 1907 г. скончыўшых сваё жыццё ажно да 1912 г."* [16, с. 70].



*Язэп Лёсік. 1930-я гг. Архіў Алесі Лёсік.*

Лютаўская рэвалюцыя ў 1917 г. знішчыла самадзяржаўе. У ноч з 1 на 2 сакавіка Часовы камітэт Дзяржаўнай думы распачаў фарміраванне Часовага ўрада. У выніку перагавораў з Выканкамам Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў быў створаны Часовы ўрад. Яго праграма прадугледжвала амністыю палітычных зняволеных, свабоду слова, друку і г. д. Гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця ў краіне дэмакратычных асноў і адраджэння нацыянальных рухаў народаў Расіі. Беларуская сацыялістычная грамада аднавіла сваю дзейнасць адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі. У звяржэнні самадзяржаўя і ўстанаўленні дэмакратычнага ладу ў Расіі яна бачыла ўмовы для сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення беларусаў.

25 сакавіка 1917 г. у Мінску адбылася канферэнцыя БСГ, дзе былі вызначаны прыярытэты па неадкладных пытаннях палітычнага жыцця краіны. У адносінах да аграрнага пытання БСГ прэтэндавала на ролю выразніка інтарэсаў беларускага сялянства, выказвалася за перадачу зямлі тым, хто на ёй працуе, але ў той жа час выступала супраць захопу сялянамі памешчыцкіх земляў, прапанавала чакаць, пакуль зямельнае пытанне вырашыць "краёвы сейм аўтаномнай Беларусі". У рэзалюцыі па аграрным пытанні зазначалася: "*У дадзены момант канферэнцыя арганізацый БСГ асуджае неарганізаваныя, анархічныя выступленні на падставе аграрных адносін*" [17, арк. 8—9].

4 чэрвеня 1917 г. у Петраградзе была склікана канферэнцыя партыі, на якую дэлегатаў прыслалі 17 арганізацый БСГ, у тым ліку Пскоўская, Мінская, Віцебская, Пецярбургская, Асіповіцкая і інш. Ад Масквы прысутнічаў дэлегат з дарадчым голасам [18. арк. 53]. Пад уплывам левага крыла, якое абапіралася на рабочых-беларусаў петраградскіх заводаў, салдат і матросаў, канферэнцыя паспрабавала выпрацаваць новую тактыку партыі з улікам развіцця рэвалюцыі і сфармуляваць некаторыя праграмныя патрабаванні.

Па аграрным пытанні праект партыйнай праграмы прадугледжваў наступныя патрабаванні: 1) забарона куплі і продажу зямлі, канфіскацыя зямлі ўдзельнай, панскай і інш. і пераход яе без выкупу ў карыстанне ўсяго народа, які на ёй працуе; 2) усёй зямлёй на Беларусі павінна загадваць Беларуская краёвая рада, яна сама парадкуе кавалкамі, патрэбнымі на перасяленне. а рэшту адабранай зямлі перадае мясцовым органам самакіравання [19, с. 3].

14 кастрычніка 1917 г. адкрыўся III з'езд БСГ. На з'ездзе былі прадстаўнікі амаль ад усіх арганізацый БСГ: з Масквы — Я.Дыла, з Петраграда — Я.Варонка, З.Жылуновіч, Б.Тарашкевіч, са Слуцка — Р.Астроўскі, з Мінска — А.Прушынскі, А.Смоліч. П.Бадунова, Л.Сівіцкая, з Гельсінгфорсу — М.Муха, з 12-й арміі — І.Мамонька, Дадон, з Барысава — Шчыцёнак, з Бабруйска — Ф.Шантыр, Талчынская, Крычко, Бакшты-Бычкоўскі і Чэрнік. з Нарвскай арганізацыі — А.Чарвякоў, з 10-й арміі — С.Рак-Міхайлоўскі, з Мінскай дружыны — В.Адамовіч і інш. [17, арк. 59].

На другі дзень з'езд пачаў разглядаць праект праграмы. якая была ўхвалена на партыйнай канферэнцыі 4—6 чэрвеня ў Петраградзе. Пасля невялікіх рэдакцыйных правак на апошнім пасяджэнні 25 кастрычніка партыйная праграма з 36 параграфаў была прынята.

У прадмове да асноўных праграмных патрабаванняў зноў было запісана, што "*Беларуская Сацыялістычная Грамада мае сваёй канчатковай мэтай ажыццяўленне сацыялістычнага ладу праз развіццё міжнароднай класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі*" [20, арк. 59]. Але, як засведчылі далейшыя падзеі, гэта быў толькі палітычны лозунг, прыняты пад ціскам левай рэвалюцыйнай часткі Грамады.

Наступныя параграфы праграмы змяшчалі пазіцыю БСГ па вырашэнні аграрнага пытання. Яшчэ ў верасні 1917 г. рэдактар "*Вольнай Беларусі*" і адзін з актыўных дзеячаў Грамады Я.Лёсік у артыкуле "*Нашы патрэбы*" прапанаваў два шляхі вырашэння зямельнага пытання. Першы шлях — Устаноўчы сойм прымае закон, што "*ўся зямля ў нашым гасударстве належыць усяму народу... Пасля гэтага кожны чалавек... можа ўзяць роўны з усімі кавалак зямлі ды сказаць, колькі дзесяцін... можна даць на душу... Гэты кавалак зямлі ніхто не мае права ні прадаць, ні заложыць, ані здаць у арэнду*" [21, с. 1].

Другі шлях прадугледжваў не дзяліць зямлю паміж сялянамі, не рэзаць яе на дзялянкі, бо пры такім парадку "*ні павернімся ў полі з вялікай машынай і будзем поркацца з сахою, як дзяды нашы поркаліся*". Гэты шлях прапаноўваў "*...пасля таго, як зацвердзіцца закон, што ўся зямля пераходзіць да рук усяго народу, дык яе не трэба дзяліць на дробныя часткі, а каму колькі*

*прырэзаць, а рэшту заставіць у вялікіх, асобных кавалках, якія будуць абрабатывацца тымі, хто не мае ўласнай гаспадаркі, — накшталт таго, як гэта робіцца на фабрыках і заводах... Дзеля загаду ўсёй працай на такіх вялікіх кавалках будзе выбірацца пры кожным месцы мясцовая "зямельная рада"* [21, с. 1].

Пасля доўгіх спрэчак на пасяджэнні 16 кастрычніка былі прыняты асноўныя прынцыпы па вырашэнні аграрнай справы, якія мала чым адрозніваліся ад праграмных патрабаванняў БСГ, прынятых на II з'ездзе ў 1906 г. і на партыйнай канферэнцыі Грамады 4—6 чэрвеня 1917 г. і адносіліся да першага шляху, які прапаноўваў Я.Лёсік: уся зямля народу; зямельнай справай ведае Краёвая рада; надзяленне адбываецца не звыш за працоўную і не менш за прадуктовую нормы [22, с. 75]. Далейшая распрацоўка зямельнай праграмы была даручана рэдакцыйнай камісіі, у склад якой увайшлі Я.Варонка, А.Смоліч, Б.Тарашкевіч, Ф.Шантыр і Я.Дыла. Неабходна адзначыць, што Ф.Шантыр не прыняў удзел у гэтай працы, бо на пасяджэнні 17 кастрычніка быў выключаны з членаў БСГ за непавагу да схода Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый [22, с. 75].

У выніку ў адносінах да зямельнай справы былі прыняты наступныя палажэнні [22, с. 75]:

13. Неадкладная забарона куплі і продажу зямлі.

14. Уся зямля без выкупу пераходзіць ва ўсенароднае ўладанне.

15. Зямля надаецца ў карыстанне толькі тым грамадзянам, якія ўласнаручна на ёй працуюць; памер надзялення складае не звыш працоўнай нормы і не менш прадуктовай.

16. Спецыяльны падатак на найбольш даходную зямлю (урадлівую, падгароднюю і г. д.) такіх памераў, каб ураўняць аплату працы на беднай і багатай зямлі, канфіскацыя пазямельнай рэнты.

17. Усім зямельным упарадкаваннем на Беларусі павінна кіраваць Беларуская краёвая рада, выбраная ўсім народам пры дапамозе ўсеагульнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага галасавання. Рада сама ведае кавалкамі для перасялення, а ўсю канфіскаваную зямлю, якая застанецца, перадае ў распараджэнне мясцовых органаў самакіравання.

18. Пераход без выкупу ўсіх лясоў, рэк, зямельных нетраў ва ўсенароднае карыстанне на распараджэнне краёвай рады.

Праграма прадугледжвала дапамогу ў арганізацыі і развіцці вытворчай кааперацыі, а таксама шырокую падтрымку і распаўсюджванне кааператыўных арганізацый, спажывецкіх і крэдытных таварыстваў і інш.

З такімі праграмнымі ўстаноўкамі БСГ заспеў Кастрычніцкі рэвалюцыйны выбух. Грамада актыўна ўключылася ў барацьбу за сацыяльную справядлівасць і нацыянальныя правы беларускага народа. Пры гэтым яна фактычна падтрымала палітыку Часовага ўрада, выказалася за скліканне Устаноўчага схода і стварэнне Расійскай федэратыўнай рэспублікі. Але ўвасобіць сваю аграрную праграму ў жыццё яна ўжо не мела магчымасці, паколькі спыніла сваю дзейнасць летам 1918 г.

1. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / АН Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск : Беларусь, 1994. Ч. 1 / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.] ; пад рэд. М. П. Касцюка. — 440 с.

2. НАРБ. — Ф. 62. Воп. 1. Спр. 204.

3. Мялешка, М. Барацьба Беларускай Сацыялістычнай Грамады за зямлю ў 1905 г. / М. Мялешка // Полымя. — 1926. — № 1. — С. 152—159.

4. Шабуня, К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии / К. И. Шабуня. — Минск : Изд-во Министерства высшего, среднего специального и професионального образования БССР, 1962. — 435 с.

5. Луцкевіч, А. За дваццаць пяць гадоў (1903—1928 гг.). Успаміны аб працы першых беларускіх арганізацыяў: Беларуская рэвалюцыйная грамада. Беларуская сацыялістычная грамада / А. Луцкевіч. — Вільня : Бел. выдавецкае тав-ва, 1928. — 52 с.

6. Собственноручные показания А. И. Луцкевича 30 октября 1939 г. // Неман. — 1995. — № 1. — С. 128—158.

7. Шлюбскі, А. А. Да гісторыі БСГ / А. А. Шлюбскі // Полымя. — 1925. — № 5. — С. 157—163.

8. Да чытацеляў / Наша Доля. — 1906. — 1 верасня. — С. 1—2.

9. Што будзе / Наша Доля. — 1906. — 1 верасня. — С. 2—3.

10. Крапіўка, Мацей (А. Пашкевіч). Прысяга над крывавымі разорамі / Мацей Крапіўка // Наша Доля. — 1906. — 1 верасня. — С. 3—4.

11. Біч, М. В. У змаганні за лепшую долю / М. В. Біч // Полымя. — 1966. — № 8. — С. 132—138.

12. Як мужыку палепшыць свае жыццё? / Наша Доля. — 1906. — № 3. — С. 2.

13. Стары Піліп (А. Бурбіс). Кароткі нарыс беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху / Стары Піліп // Вестник Народного Комиссариата просвещения БССР. — 1921. — № 1. — С. 4—9. — № 2. — С. 4—10.

14. Наша Ніва. — 1906. — № 1. — С. 1.

15. Турук, Ф. Белорусское движение: очерк истории национального движения белоруссов / Ф. Турук. — М. : Госиздат, 1921. — 144 с.

16. Жылуновіч, З. Два бакі беларускага руху / З. Жылуновіч // Полымя. — 1923. — № 3—4. — С. 69—74.

17. НАРБ. — Ф. 60. Воп. 3. Спр. 179.

18. НАРБ. — Ф. 60. Воп. 3. Спр. 749.

19. Пастановы Канферэнцыі БСГ // Вольная Беларусь. — 1917. — 27 ліпеня. — С. 3.

20. НАРБ. — Ф. 60. Воп. 3. Спр. 749.

21. Лёсік, Я. Нашы патрэбы / Я. Лёсік // Вольная Беларусь. — 1917. — 17 верасня. — С. 1.

22. Программа Белорусской Социалистической Громады (принята III партийным съездом. 14—25 октября 1917 г. в Минске) // Палітычныя партыі Беларусі : дапам. для вывучаючых гісторыю Беларусі. — Мінск : Згода, 1994. — С. 74—75.

*Паступіў у рэдакцыю 05.03.2024.*